Аддзел адукацыі Жыткавіцкага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Хільчыцкая сярэдняя школа”

# Усебеларуская маладзёжная экспедыцыя
# “Маршрутамі памяці. Маршрутамі адзінства”

## Кірунак працы
## “Героі зямлі Беларускай”

## Творчы праект
## “У жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу”



Аўтар праекта
Блоцкая Валерыя,
вучаніца 10 класа

Кіраўнік:
Комар Юрый Мікалаевіч,
настаўнік гісторыі

2022 г.

У гісторыі ёсць асаблівыя моманты, падзеі, асаблівыя даты. Дастаткова імгнення, каб стаць героем, але неабходна цэлае жыццё, каб стаць сапраўдным чалавекам. Прайшло 45 гадоў з таго вераснёўскга дня, калі наш зямляк Міхаіл Мароз зрабіў свой крок у бессмяротнасць. Вырасла новае пакаленне, але памяць аб Мішы жыве ў нашых сэрцах.



Нарадзіўся Міхаіл Мароз 28 лістапада 1959 года ў в. Бярэжцы Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Маці, Вольга Іванаўна Мароз, прадавец сельскай крамы. Бацька, Міхаіл Сцяпанавіч Мароз, трактарыст Жыткавіцкага леспрамгаса. Простыя вяскоўцы, адметнага выхавання даць не маглі, але сваімі шчырымі сялянскімі сэрцамі імкнуліся да аднаго: каб дзеці былі сумленнымі людзьмі. Дом іхні стаяў на людным месцы і вокны глядзелі на плошчу. Побач з домам калодзеж. Крыху далей масток, дзе летнімі вечарамі збіраліся вясковыя хлопцы і дзяўчаты. Хутка Міша падрос, яму пара ў школу. Вучыўся спачаткуў пачатковай школе ў роднай вёсцы, а потым у Хільчыцкай сярэдняй школе. Ад Бярэжцаў да школы болей 5 кіламетраў. Школы-інтэрната тады яшчэ не было, і Мішы кожны дзень даводзілася праходзіць гэтую адлегласць двойчы. Толькі ў зімовую замяць заставаўся ён начаваць у Хільчыцах у сяброў ці старэнькай прабабкі. Як сведчаць настаўнікі, нічым асабліва не вызначаўся. Просты, сумленны, у меру старанны, у меру гарэзлівы хлопец, як большасць яго аднагодкаў. Любімы прадмет – літаратура. У сумцы побач з падручнікамі заўсёды ляжала якая-небудзь кніжка з бібліятэкі. Асабліва любіў пра вайну, пра разведчыкаў, пра смелых падарожнікаў. Прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх спартыўных мерапрыемствах. Вельмі любіў дзяцей, таму і паступіў у 1974 г. ў Аршанскае педагагічнае вучылішча.



У вучылішчы 88-й групе, у якой вучыўся Міша, зайздросцілі. Заўсёды яны разам. А на канікулах дзе толькі не пабывалі! І ў Брэсце, і ў Мінску, і ў Хатыні, і ў Ленінградзе. Грошы на паездкі зараблялі на ўборцы ураджаю ў калгасах. У альбомах у хлопчыкаў і дзяўчынак захоўваюцца здымкі: фатаграфаваліся ля сцен Брэсцкай крэпасці, ля легендарнай «Аўроры». Ёсць на

фатаграфіях і Міша Мароз. Яго адразу вылучыш: самы высокі, самы стройны сярод маладых і спрытных хлопцаў 88-й групы.



А калі настаў яго зорны час, не пахіснуўся, не здрадзіў, да канца, мужна выканаў свой абавязак перад людзьмі, перад Радзімай…

7 верасня 1977 г., як звычайна, навучэнцы педвучылішча дапамагалі на ўборацы бульбы калгаснікам калгаса “Прагрэс” Дубровенскага раёна. Ціхі пагодлівы дзень не прадвяшчаў бяды. А яна была тут побач, ляжала на мірным полі звыш 30 гадоў, з часу мінулай вялікай вайны…

Чорны, пакрыты зямлёй і іржой снарад, выхаплены камбайнам з разаранай баразны, рухаўся па транспарцёры разам з бульбянымі клубнямі. Калі яго заўважылі, спыняць камбайн было ўжо позна. Секунда, другая – і з'едзены іржой снарад затрасе на стале-вібратары, кіне ў барабан. І хто ведае, што тады будзе?

А на камбайне чацвёра студэнтаў – вось яны, побач. Глядзяць здзіўлена на паўзучы снарад. А яшчэ пяты – трактарыст, шосты – камбайнер. Яны ўвогуле нічога не падазраюць аб паўзучай бядзе…

Часу для роздумаў не заставалася. Першым гэта зразумеў Міша. Асцярожна падхапіўшы снарад, ён нязграбна саступіў на зямлю і паволі пакрочыў па разараных барознах.

Ліпаў яр, дзе хлопцы збіраліся разам у кароткія гадзіны адпачынку, ляжаў на краі поля, крокаў за стопяцьдзясят. Па разварочаным полі ісці няёмка, да гумовых ботаў ліпне размоклая ад дажджу зямля. Снарад кілаграмаў васьмі на выцягнутых руках здаецца сама меней двухпудовым.

Нарэшце пад нагамі цвёрдая зямля. Утаптаная сцяжынка бяжыць уздоўж поля. А за кустамі роў. Яшчэ некалькі крокаў...

І ў гэты час раздаўся аглушальны выбух. Пракаціўся над полем і глуха згас удалечыні, пакінуўшы пасля сябе звінячую цішыню.

Ад камбайнаў беглі людзі, беглі Мішыны аднакурснікі, якія яшчэ не зразумелі, што ж адбылося.

— Ці то спатыкнуўся і выпусціў цяжкі мокры снарад, ці неасцярожна апусціў яго... Мы так і не зразумелі. Падбеглі, а ён увесь у крыві... Рукі цэлыя, а ногі... Хутка, як умелі, перавязалі. Толькі ўся наша павязка хутка сачылася крывёй.

Гэта расказваў Мішын таварыш Аляксей Гарнакоў на наступную раніцу пасля выбуху.

Амаль трое сутак змагаліся дактары за жыцьцё Міхаіла. Прыбыла група хірургаў з Мінска па спецыяльным распараджэнні міністра аховы здароўя рэспублікі. Рабілі ўсё магчымае. І трое сутак дзяжурылі пад вокнамі бальніцы Мішыны таварышы, хлопцы з Аршанска педагагічнага вучылішча. Усё думалася: раптам можа тэрмінова спатрэбіцца кроў ці якая-небудзь іншая дапамога запатрабуецца?

Зрэдку да Мішы вярталася прытомнасць. Спачатку здзівіўся, што побач ля ложка маці ў белым халаце: шлях ад палескай вёскі Бярэжцы да Оршы зусім не блізкі. Першае, што спытаў: як пачуваецца з дарогі? У маці хворае сэрца – ён гэта ведаў і заўсёды стараўся зберагчы яе ад лішніх хваляванняў. Нават калі ў яго здараліся якія-небудзь непрыемнасці ў тэхнікуме, аб адным прасіў класнага кіраўніка Івана Ермалаевіча: каб маці не расказваў.




Але ўсе намаганні аказаліся марнымі. Мішы не стала. Ён быў пахаваны на могілках роднай вёскі.

Апошнія крокі Мішы Мароза на зямлі сталі крокамі яго ў неўміручасць… На месцы подзвігу Мішы Мароза ў Дубровенскім раёне насыпаны курган, устаноўлена мемарыяльная пліта. На ёй высечаны словы: “На гэтым полі ў вераснёвы дзень 1977 г. стаў на шляху смерці 17-гадовы камсамолец Міхаіл Мароз, які аднёс ад людзей снарад, пагражаўшы бядой…”

У камсамольскім білеце Мішы Мароза зроблены запіс: “Вынес з поля баявы снарад, адвёў ад людзей бяду цаной уласнага жыцця”. Ён загінуў як салдат і ўзнагароджаны пасмяротна баявым ордэнам Чырвонай Зоркі (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 28. 10. 1977). Імя героя-камсамольца навечна занесена ў Кнігу гонару



ЦК ВЛКСМ побач з Зояй Космадзям’янскай, Лізай Чайкінай, Сяргеем Цюленіным…

Імем М. М. Мароза быў названы пасажырскі цеплаход Галоўнага ўпраўлення рачнога флоту пры Савеце Міністраў БССР; яго імя прысвоена піянерскім дружынам шэрагу школ краіны; у музеі Аршанскага педвучылішча, дзе ён вучыўся, яму прысвечана экспазіцыя; на могілках в. Бярэжцы ўстаноўлены помнік, паблізу в. Бурая Дубровенскага р-на — мемарыяльная пліта.



12 снежня 1981 г. у двары сярэдняй школы № 1 г. Жыткавічы на ўрачыстым мітынгу быў адкрыты помнік Мішы Марозу.



28 лістапада 2011 года адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі Мішы Мароза ў будынку новай школы в. Хільчыцы.

Данінай павагі подзвігам мірнага пасляваеннага часу стаў адкрыты конкурс літаратурнай творчасці “Незабыўны подзвіг. Міша Мароз” Гомельскага абласнога аддзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”. Адным з пераможцаў конкурса ў намінацыі “Паэзія” стала Валянціна Марчанка

**Посвящается подвигу Михаила Мороза**
Твой подвиг летит через годы.
Есть люди особой породы,
Мы им посылаем привет
Бессмертною памятью лет.

…По-детски желанье простое –
Обнять всех своей добротою,
Готов и беду укротить —
Да горе… А жить бы да жить.

Не вздор это вовсе, не шалость,
До рва уже – самая малость,
И вдруг так нежданно – «бабах»,
И ужас – в застывших сердцах.

Ушёл ты на взлёте, в начале,
(Надрывно девчонки кричали…)

И жизнь отлетела, как птах,
Улыбка – на бледных губах.

Вчера ещё – просто ребёнок,
Сегодня – герой погребённый,
Кто смерть, обнимая, унёс,
Герой Михаил Мороз.

Твой подвиг летит через годы.
Есть люди особой породы,
Мы им посылаем привет
Бессмертною памятью лет.

*Валентина Марченко*



**Дадатак**

## МАРШРУТ ЭКСКУРСІІ




1 – в. Хільчыцы – Мемарыяльная дошка Міхаіла Мароза, музейныя матэрыялы
2 – могілкі в. Бярэжцы – Магіла Міхаіла Мароза
3 – в. Бярэжцы – Дом бацькоў Міхаіла Мароза
4 – г. Жыткавічы – Помнік Міхаілу Марозу

## Этапы даследавання:

1. Наведванне пакоя педагога-арганізатара, дзе захоўваюцца матэрыялы музейнай экспазіцыі М. Мароза.

2. Вывучэнне летапісу гісторыі ДУА “Хільчыцкая сярэдняя школа”.

3. Вывучэнне публікацый пра Міхаіла Мароза:

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Жыткавіцка раёна. – Мн.: Ураджай, 1994. – 767 с.

4. Праца з Інтэрнэт-рэсурсамі:

https://www.palese.by/2009/12/Syn-rodnoj-zemli/

https://biography.wikireading.ru/172555

5. Афармленне матэрыялаў экскурii.

6. Размяшчэнне матэрыялаў на сайце ўстановы адукацыі для агульнага доступу (рэжым доступу https://hil.schools.by/pages/grafk-fakultatyva-abjadnannja-pa-ntaresah-na-20152016-navuchalny-god).

## Культурна-асветніцкая дзейнасць

1. Абагульненне і сістэматызацыя сабранага матэрыялу.

2. Распрацоўка сцэнарыя выхаваўчага мерапрыемства “Ёсць памяць, якой не будзе канца” і ўдзел у ім.







3. Афармленне маршрута экскурсіі па месцах увекавечання памяці Міхаіла Мароза.

4 Размяшчэнне матэрыялаў на сайце ўстановы адукацыі для агульнага доступу (рэжым доступу https://hil.schools.by/pages/grafk-fakultatyva-abjadnannja-pa-ntaresah-na-20152016-navuchalny-god).

5. Уключэнне ў план працы ГА БРСМ арганізацыі догляду магілы героя-камсамольца.






6. Традыцыяй стала правядзенне ў школе Тыдня памяці Міхаіла Мароза







**Рапарт здае камандзір атрада імя Міхаіла Мароза**



## З асабовай справы Міхаіла Мароза



Дата 2 чэрвеня

1973/1974 навуч. год Вучань Мароз Міхаіл Міхайлавіч на працягу года вучыўся з адзнакамі „здавальняюча" і „добра". Здольны, мог бы займацца значна лепш, але не стараецца. Паводзіны здавальняючыя. На ўроках можа па-размаўляць, самавольны, іншы раз грубіяніць. Дружыць з аднакласнікамі. Мае лепшыя адзнакі па літаратуры, гісторыі, алгебры і геаметрыі. Мала ўдзельнічаў у грамадскай рабоце і грамадскім жыцці школы. Актыўна ўдзельнічаў у грамадска-карыснай працы.

Клас VIII Б

Дырэктар Хілоцкай школы ____ (подпіс)

Класны кіраўнік [подпіс]

Дата 28 чэрвеня 1974.

# Адкрыццё мемарыяльнай дошкі Міхаіла Мароза







## Копія пастановы аб стварэнні помніка Міхаілу Марозу

Копия.

СОВЕТ МИНИСТРОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР

П О С Т А Н О В Л Е Н И Е

от 8 августа 1978 года № 241

г.Минск

О сооружении памятника комсомольцу
М.Морозу в г.Житковичи.

Совет Министров Белорусской ССР ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1.Соорудить памятник комсомольцу М.Морозу в г.Житковичи до 1 октября 1981 года.

Финансирование проектирования и сооружения указанного памятника сметной стоимостью до 25 тыс.рублей в установленном порядке осуществляет Гомельский облисполком.

2.Министерству культуры БССР и Союзу архитекторов БССР до 1 сентября 1979г. обеспечить разработку проектно-сметной документации на сооружение памятника М.Морозу в г.Житковичи.

Союзу художников БССР принять меры к изготовлению скульптурной части памятника до 1 июля 1081г.

3.Гомельскому облисполкому обеспечить выполнение работ по сооружению памятника М.Морозу.

Председатель Совета Министров
Белорусской ССР — Т.Киселев

Зам.Управляющего Делами Совета
Министров Белорусской ССР — Н.Юхнель

Верно

Зав. общим отделом
Житковичского райисполкома

4.09.1978г.